# БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ

№2 (285)
люты 2026

Інфармацыйны бюлетэнь • Супольнасць беларусаў свету “Бацькаўшчына”


**У НУМАРЫ:**

## Алесь Кіркевіч: “Смаленне вепрука” – дапаможнік: на што звярнуць увагу, а на што – не губляць час

Не сакрэт, што многія беларусы траўмаваныя школьнымі ўрокамі беллiту. Як пераадолець гэтую траўму і прыцягнуць неафітаў да беларушчыны? Пра гэта, а таксама пра іншыя выклікі, якія стаяць перад камандай, размаўлялі аўтар папулярнага літаратурнага відэапраекта “Смаленне вепрука” Алесь Кіркевіч і вядоўца падкасту Настасся Суханосік. Сустрэча адбылася ў межах Стральцоўскага фэсту, які прайшоў сёлета ў Варшаве.

Старонка 2

## Як стваралася “Ніва”

70 гадоў таму, 4 сакавіка 1956 года, у Беластоку пачала выходзіць газета беларусаў Польшчы “Ніва”. Яна перажыла і “лагодных” камуністаў, і часы вайсковага стану, які ўвёў у пачатку 1980-х генерал Ярузэльскі. Не пахавала газету і эпоха распаду сацыялістычнага лагеру. Гісторыя стварэння легендарнага выдання, якое выходзіць і цяпер на Падляшшы.

Старонка 2



Фото: Peeter Lillevali / Pohjarannik

# Зінаіда Клыга: ПАКУЛЬ МАГУ, БУДУ ПРАЦЯГВАЦЬ ТОЕ, ШТО З МЯНЕ ПАЧЫНАЛАСЯ

Таварыства беларускай культуры “БЭЗ” было створана ў Іда-Вірумаа ў канцы сакавіка 1989 года і дзякуючы намаганням энтузіястаў ужо больш за тры дзесяцігоддзі займае прыкметнае месца ў мультыкультурнай карціне рэгіёну. Зінаіда Клыга, адна з тых, хто быў ля вытокаў, пятнаццаць гадоў таму ўзначаліла Таварыства. 25 студзеня яна адзначыла юбілей – ёй споўнілася восемдзесят гадоў. Напярэдадні ўрачыстасці журналістка эстонскага партала “Паўночнае ўзбярэжжа” сустрэлася са спадарыняй Зінаідай Клыгай у офісе Таварыства (Нійду, 4 у Йыхві) – узгадалі мінулае, а таксма пагаварылі пра сучаснасць і планы на будучыню.

**– Дзейнасць грамадскіх арганізацый заўсёды трымаецца на энтузіястах і энтузіязме. Адкуль яго чэрпаць у складаным сучасным жыцці?**

– Простых часоў не бывае – праблемы ёсць заўсёды. Энтузіязм падсілкоўваецца ад усведамлення прыналежнасці да сваіх каранёў, культуры і традыцый продкаў, якія не хочацца страціць, нават знаходзячыся далёка ад гістарычнай радзімы. Назапашаны вопыт перадаецца з пакалення ў пакаленне, гэта часцінка нас саміх.

Калі мы пачыналі, было працей – мы гарэлі ідэяй аб’яднання, быў вельмі вялікі ўздым энтузіязму, многія актывісты выраслі на гістарычнай радзіме, больш-менш ведалі мову, традыцыі, захаваліся родныя сувязі і знаёмствы. Тым, хто нарадзіўся і вырас тут, складаней. Таму заўсёды спрабавалі прыцягваць моладзь, каб дзеці адчувалі свае карані і ведалі шматвяковую культуру, спадкаемцамі якой яны з’яўляюцца. Стараемся перадаць наступным пакаленням усё, што ведаем і ўмеем. Хоць гэта зусім не проста, традыцыі лепш захоўваюцца ў сем’ях, дзе падтрымліваецца свой лад, дзе часта ездзяць на гістарычную радзіму.

Працяг на старонцы 4.


НЕ ВАЙНЕ!

ВЫ МОЖАЦЕ ДАПАМАГЧЫ

навіны

# Алесь Кіркевіч: "Смаленне вепрука" – дапаможнік: на што звярнуць увагу, а на што – не губляць час

Не сакрэт, што многія беларусы траўмаваныя школьнымі ўрокамі белліту. Як пераадолець гэтую траўму і прыцягнуць неафітаў да беларушчыны? Пра гэта, а таксама пра іншыя выклікі, якія стаяць перад камандай, размаўлялі аўтар папулярнага літаратурнага відэапраекта "Смаленне вепрука" Алесь Кіркевіч і вядоўца падкасту Настасся Суханосік. Сустрэча адбылася ў межах Стральцоўскага фэсту, які прайшоў сёлета ў Варшаве. "Будзьма беларусамі!" запісалі самыя цікавыя думкі, што прагучалі падчас імпрэзы.



"Смаленне вепрука" – малады праект кампаніі "Будзьма беларусамі!", які ўжо набірае добрыя прагляды на YouTube. Як кажа аўтар праекта, калумніст "Будзьма беларусамі!" Алесь Кіркевіч, праект разлічаны ў першую чаргу на неафітаў, людзей, не надта абазнаных у беларускай літаратуры, але якім яна стала цікавай.

### Як стваралася "Смаленне вепрука"

"Думаю, што не схлушу, калі скажу, што многія з нас былі траўмаваныя ў школе беллітам. Гэта лічылася чымсьці нецікавым, нам падавалася, што там аніякага канфлікту няма, ці гэты канфлікт нам падаваўся неактуальным. Гэта былі вечныя ралля, гоні, хата, пахілены плот. Адсядзім урок і пойдзем далей, – распавядае Алесь Кіркевіч.

– Мы стварылі свой прадукт, каб абвергнуць, перавярнуць гэтую карціну і паглядзець на беларускіх аўтараў, беларускія кнігі пад нейкім іншым вуглом. Мы не ствараем нейкую энцыклапедыю ці нейкі аб'ектыўны нарыс, партрэтную галерэю беларускіх літаратараў, не ствараем дапаможнік для школьнай праграмы. Гэта суб'ектыўны погляд на тых аўтараў, на тыя кнігі, якія нам цікавыя. І самае галоўнае – гэта, хутчэй, запрашэнне да размовы, запрашэнне да чытання, запрашэнне да рэфлексій.

На маю думку, кнігі існуюць тады, калі мы іх не толькі чытаем, а яшчэ і рэфлексуем, гаворым пра іх між сабой".

Паводле аўтара, аўдыторыя гэтага падкасту – "не тыя, хто прыйшоў на Стральцоўскі фэст, гэта прадукт для неафітаў, для тых людзей, якія, можа быць, першы раз чуюць нейкія прозвішчы ці назвы кніг, гэта запрашэнне такіх людзей у свет беларускай кнігі".

Алесь Кіркевіч нагадвае фразу Сяргея Дубаўца, што ягонае пакаленне было апошнім, якое магло прачытаць усё, напісанае па-беларуску, абсалютна ўсё – ад і да:

"Зараз, на шчасце, мы ўжо не можам пры ўсім жаданні прачытаць усё напісанае і перакладзенае на беларускую мову. І ў пэўным сэнсе ў гэтым моры наш падкаст "Смаленне вепрука" з'яўляецца дапаможнікам: на што варта звярнуць увагу, на што не варта ніколі звяртаць увагу – паглядзіце наша відэа і не губляйце час".

### "Гэта не пра канкурэнцыю"

Вядоўца праекта Настасся Суханосік называе сябе "аматаркай літаратуры", хоць заўсёды была звязаная з тэатрам і літаратурай, нават мела "свой уласны маленькі YouTube-канал – але пра дзіцячую літаратуру".

Паводле Настассі, "Смаленне вепрука" робіць сапраўды добрую справу: "У YouTube, а гэта ўсё ж сучаснае тэлебачанне, такіх праектаў няшмат, можна сказаць, адзінкі. Лічу, што такіх праектаў мусіць быць значна больш. Я кажу тут не пра канкурэнцыю, а пра тое, што, каб дайсці да гледача, трэба розныя-розныя крыніцы гэтай самай інфармацыі. Мы працуем даволі невялікай камандай, гэта ўсё ствараецца ў Беластоку. Мне падабаецца, што я як вядоўца магу працаваць непасрэдна з аўтарам выпуску, можам сесці і паразмаўляць, пачуць думку аўтара і разабрацца, што ён меў на ўвазе пад тым ці іншым выразам".

Самым важным Настасся Суханосік называе тое, што прадукт дасягае Беларусі: "Амаль 40% праглядаў непасрэдна з тэрыторыі Беларусі. Гэта – супер, гэта вельмі добры паказчык. Пад кожным выпускам можна паглядзець колькасць каментароў.

Гэта ўражвае – людзі чытаюць, людзі слухаюць, людзі спрачаюцца, людзі дзякуюць. Ёсць і негатыўныя каментары, але гэта добра – значыць, ёсць куды расці. А ёсць і такія каментары, якіх вы не ўбачыце ў YouTube, шмат хто з Беларусі піша ў асабістыя. Адзін прыхільнік з Менску піша пасля кожнага выпуску, дзякуе і пытаецца пра ўсё літаратурнае, просіць парадаў, пытае, пра што яшчэ будуць выпускі. Мне падаецца, гэта – поспех, такі малады праект – і ўжо мае сваю супольнасць. Нават мае адвакатаў брэнду".

### "Мы – спажыўцы літаратуры"

На думку Алеся Кіркевіча, важна каб аўтар падкасту не быў акадэмічным спецыялістам, "не быў дэфармаваны і занураны ў сваю нейкую тэму, занадта далікатным з датамі, абагульненнямі, высновамі": "Мы не абцяжараныя гэтым, мы – спажыўцы літаратуры, можам расказваць пра тое, што нам падабаецца ці не падабаецца. І гэта дае пэўны эфект лёгкасці".

### Выклікі

"Першы – глабальны, ён датычны ўсяго беларускага літпрацэсу. Вось ва Украіне не трэба людзям распавядаць пра Шаўчэнку, у Польшчы – пра Міцкевіча з Ажэшкай. А ў нас такое ўражанне, што нам яшчэ трэба ўкладаць камяні ў фундамент, бо ў часткі людзей яшчэ няма ведаў пра асновы.

То-бок калі б у нас было ўсё добра з адукацыяй, з кнігавыданнем, з гуманітарнай сферай у цэлым у Беларусі, то нам не трэба было б распавядаць беларусам, хто такі Караткевіч, Сыс ці раскрываць незразумелыя моманты ў жыцці Купалы – гэта б было хрэстаматыйнымі рэчамі.

Вось кампанія "Будзьма беларусамі!" і займаецца тым, што канструюе гэты гуманітарны будынак, будынак беларускай ідэнтычнасці наноў. І адначасова трэба быць сучаснымі. Трэба сягаць у сучасную літаратуру, карыстацца сучаснай мовай і сродкамі.

У пэўным сэнсе мы маем праблему з аўдыторыяй, з выбаркай тэмаў: на што звяртаць больш увагі – на сучаснае ці ўсё ж такі больш сягаць у мінулае, пра якое нам у школе не распавядалі? Мы хочам сцвярджаць, што беларушчына – гэта цікава, хоць у школах маглі даць зразумець адваротнае".

Паводле Алеся Кіркевіча, ёсць праблема і з фідбэкам: "Мы не можам атрымліваць вялікую колькасць каментароў з Беларусі. Украінскія каналы такой праблемы не ведаюць. У нас жа – паўпадпольная сітуацыя, мы не бачым усёй карціны. Ізноў жа, ці можам рабіць сюжэты пра аўтараў, якія засталіся ў Беларусі? Ці не стане гэта праблемай для іх?"

А вось Настасся Суханосік называе сваім выклікам яшчэ і "выкшталцоную беларускую мову":

"Нам часта прылятае за "камон", напрыклад, за яшчэ нешта такое слэнгавае, але ж беларуская мова – жывая, ну камон! Так, я раблю памылкі, я таксама яшчэ вучуся, мая першая мова – руская, і я гэтага не саромеюся. Я бачыла каментары пра мой расейскі акцэнт. Так, гэта праўда. І праўда тое, што я пайшла на курсы маўлення за ўласныя грошы, каб выправіць гэта, бо для мяне гэта важна. Важна, каб слухачы і гледачы атрымоўвалі асалоду ад праграмы. На беларускую стала я перайшла тры гады таму. Але каментары грамарнацы не адаб'юць жадання з ёй заставацца".

Напрыканцы сустрэчы Алесь Кіркевіч падкрэсліў важнасць адкрыцця для беларусаў цэлага пласту невядомых шырокай публіцы аўтараў:

"Варта гаварыць і пра эміграцыйных аўтараў. Зразумела, што праглядаў столькі не будзе, як з Караткевічам. Але казаць варта – і я буду старацца гаварыць пра іх на нашым канале. У нас дзясяткі не прачытаных шырока і глыбока аўтараў. Трэба гэта ўсё прагаварыць і заахвоціць людзей да чытання, рэфлексій і дыялогу".

**Рыгор Сапежынскі, budzma.org**

юбілей

# ЯК СТВАРАЛАСЯ “НІВА”

70 гадоў таму, 4 сакавіка 1956 года, у Беластоку пачала выходзіць газета беларусаў Польшчы “Ніва”. Яна перажыла і “лагодных” камуністаў, і часы вайсковага стану, які ўвёў у пачатку 1980-х генерал Ярузэльскі. Не пахавала газету і эпоха распаду сацыялістычнага лагеру. “Будзьма беларусамі!” расказвае гісторыю стварэння легендарнага выдання, якое выходзіць і цяпер на Падляшшы.

Прыгадваючы гісторыю паўставання “Нівы”, варта разумець кантэкст той эпохі. Улады Польскай Народнай Рэспублікі таго перыяду, з аднаго боку, вядома, спрыялі паланізацыі краіны. А з іншага боку, не маглі не лічыцца з тым фактам, што на Беласточчыне спакон веку пражываюць не толькі палякі, але таксама і беларусы. Спрабуючы знайсці лаяльнасць сярод беларусаў-аўтахтонаў, было вырашана стварыць культурніцкія арганізацыі, а таксама дазволіць ім мець свой легальны друк.

Так, у лютым 1956 года было створана Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ), а яго друкаваным органам стала газета “Ніва”. Сігнальны экземпляр быў надрукаваны ў час першага з’езду арганізацыі яшчэ 28 лютага, а ў тыраж першы нумар газеты пайшоў 4 сакавіка 1956 года, фактычна даўшы пачатак новай эры для беларусаў Беласточчыны.

## Першы рэдактар “Нівы” – хросны бацька для беларускай літаратуры ў Польшчы

Першым рэдактарам, фактычна заснавальнікам, быў Георгій Валкавыцкі – чалавек з дастаткова цікавай біяграфіяй нават для мацерыковай Беларусі. Нарадзіўся ў 1923 годзе ў Белавежы, вучыўся ў сямігодцы, потым у Гайнаўцы на слесара, а ў выніку скончыў Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага ў Маскве. Дыплом аб вышэйшай адукацыі такога ўзроўню быў па тых часах самым сапраўдным уваходным квітком на самы верх для літаратара.

Юрка Валкавыцкі мог бы без праблем знайсці сабе працу ў Варшаве, Мінску або Маскве. Але з нейкіх прычынаў ён сам прыняў цвёрдае рашэнне вярнуцца на малую радзіму і там узяцца за развіццё беларускай літаратуры. Пазней ён узгадваў у сваіх успамінах:

“У 1954 годзе скончыў я Літаратурны інстытут , і пытанне “што далей?”, якое дагэтуль тайком скрабло па сэрцы, устала ў поўны рост. У інстытуце прасяк ідэяй вяртання ў народ. Ведаў: жыццё багатае і чым ніжэй – гусцейшае. А што літаратура – адлюстраванне жыцця, не было сумнення. Сталічная прапіска пагражала творчым выпустошэннем, і я даўно яе з галавы выкінуў. Толькі ўніз! Там невычэрпная руда для тваіх твораў”.

Пры гэтым Беласток не быў родным горадам для Валкавыцкага, як не была вядомай і справа стварэння газеты. Але трэба думаць, што партыйныя чыноўнікі даверылі маладому літаратару такую адказную (ва ўсіх сэнсах) справу, бо тое дазвалялі і ягоная адукацыя, і кампетэнцыі, і надзвычай шырокі кругагляд:

“Неадкладна паехаў у Беласток. Горада не ведаў, у Варшаве параілі пагаварыць з сакратаром прапаганды ВК ПАРП. Быў ім тут Мар’ян Ксёнжа. Нягледзячы на санавітае прозвішча, прыняў без тэлефоннай валакіты. Выслухаўшы, паклікаў адказнага працаўніка і загадаў уладкаваць у “Беластоцкую газету”. Намякнуў таксама на нейкія “беларускія” выданні, з якімі, магчыма, буду мець дачыненне. Беларускамоўныя выбарчыя лісткі, ці што?”.

Ці варта казаць, што Георгій Валкавыцкі, жадаючы вярнуцца на Падляшша, выбраў сабе працу самастойна. Як ведаў наперад, што будзе не проста рэдактарам рэгіянальнай газеты адной з нацыянальных меншасцяў, але стане самым сапраўдным хросным бацькам для беларускай літаратуры ў Польшчы.

## “Гэта наша адзіная газета на беларускай мове”

Як ні круці, а многія з’явы трымаюцца выключна на асобах. Скажам, каб “Ніву” ачоліў іншы чалавек, менш пасіянарны, то і газета магла б называцца неяк інакш. Георгій Валкавыцкі ўкладаў у назву даволі сур’ёзны сэнс – наўпроставая повязь з той самай “Нашай Нівай”, якая выходзіла на пачатку XX стагоддзя ў Вільні. Дзе друкаваліся Янка Купала і Якуб Колас, Цішка Гартны і Максім Гарэцкі, а таксама многія іншыя творы часоў беларускага Адраджэння:

“Пачаў танцаваць ад загалоўка, як часам рабіў і пры вершах. З маіх навокалзагаловачных піруэтаў не засталося ніякага следу. Помню толькі, што, шукаючы імя, канкрэтызаваў і характар тыднёвіка. Адкідваў двухчленныя назвы. Яны ад бяссілля выказаць думку коратка. А імя часопіса – сціслая думка. Павінна быць простай, суцэльнай і даходлівай. Браў таксама пад увагу кальпарцёраў і шырокую грамадскасць.

Не ўсе ведаюць беларускую мову, а нам неабыякавы асацыяцыі, якія выкліча ў людзей наш тыднёвік. Вельмі хацеў уплесці гістарычнае карэнне. Беласточчыне аднак не пашанцавала з беларускімі выданнямі. Паспрабуйце, напрыклад, адаптаваць “Мужыцкую праўду”. “Сялянская праўда”? “Вясковая праўда”? Вузка. Хоць і асноўную чытацкую базу размясціў у беластоцкай вёсцы, не завужваў тыднёвіку гарызонт вясковымі рамкамі. Гэта наша адзіная газета на беларускай мове. Ужо амаль адчуваў дотык працягнутай з гісторыі рукі, таксама “адзінай” віленскай “Нашай нівы”. Шмат чаго ў нас знойдзецца супольнага – вынік той жа “адзінасці”. Значыць, з загалоўкам справа ясная. Да прастаты і даходлівасці дадаў мілагучнасць і падтэкст”.



У Менску такі фінт наўрад ці прайшоў, бо культ Сталіна, а разам з ім вульгарнае разуменне гісторыі і культуры яшчэ не быў скасаваны. Адпаведна і “Ніша Ніва” лічылася выданнем буржуазным – пра яго казалі і згадвалі ў падручніку, дык толькі адным сказам. Не болей. А ў Беластоку ніхто з партыйных функцыянераў нават і не звярнуў увагі. Зрэшты, а ці добра тыя польскія партыйныя апаратчыкі ведалі беларускую гісторыю? Пытанне, якое не патрабуе адказу.

## Першы нумар

Не без іроніі, якая была заўсёды ўласцівая Георгію Валкавыцкаму ў ягонай творчасці, ён згадвае і самы першы нумар выдаванай і рэдагаванай ім газеты, які пабачыў свет фактычна ў часе першага з’езду БГКТ, каторы адбыўся ў самым канцы лютага 1956 года:

“У першы нумар змясцілі не толькі абшырную справаздачу са з’езда, але і скарочаны даклад. Надрукавалі іншую дакументацыю: асабовы склад Галоўнага праўлення, прэзідыума і сакратарыята (праіснаваў толькі да II з’езда), Галоўнай рэвізійнай камісіі, пастановы і даніну часу – вернападданніцкі ліст “тав. Баляславу Беруту”.

Забраўся ў раскладушку і Мікалай Матэйчук: вершам славіў з’езд і светлы шлях, што перад намі. Праракам не стаў, але, як бы ні было, адкрыў дарогу на літаратурны палетак. Замыкаў нумар палкі паклоннік Сонькі Залатаручкі Дзядзька Лявон (Станіслаў Вагурка). Як і пасавала адэсіту, адчуўшы ў нас сваяцкую цягу да гумару, ціснуў на ўсе педалі і неўзабаве ачоліў касяк самых папулярных аўтараў “Нівы””.

## “Ніва” ўчора і сёння: уплыў на развіццё беларускай літаратуры

Акрамя інфармацыі аб дзейнасці БГКТ, рэдакцыя новапаўсталай газеты змяшчае на яе старонках допісы аб жыцці на Беласточчыне, друкуе краязнаўчыя матэрыялы і ў тым ліку мясцовыя беларускія легенды, паданні і песні. Ёсць і старонка для дзяцей, якая называецца “Зорка”. На старонках “Нівы” друкуюцца творы членаў літаратурна-мастацкага аб’яднання “Белавежа”, якое з’явілася неўзабаве – арганізацыйны з’езд гэтай літаратурнай арганізацыі адбыўся ў чэрвені 1958 года.

І гэта стала сапраўднай падзеяй, бо акурат праз вычын Валкавыцкага беларуская літаратура займела такую сваю варыяцыю, як беларуская літаратура Польшчы.

Мала хто ведае, але ў Польшчы беларусы – ці не адзіная нацыянальная меншасць, якая мае сваю ўласную літаратуру з традыцыямі і імёнамі, якія шануюцца і на мацерыку – Сакрат Яновіч, Надзея Артымовіч, Віктар Швед і многія іншыя.

Неўзабаве газета пачне друкаваць не толькі беларускіх аўтараў з Польшчы, але і беларусаў з Беларусі. Прычым з часам друкавацца на яе старонках пачнуць і тыя паэты і пісьменнікі, якія ў БССР лічыліся непажаданымі і нават забароненымі. Пасля распаду сацыялістычнага лагеру і падзення камуністычнай улады ў Польшчы рэдакцыя развітаецца і з БГКТ, якое было дастаткова кансерватыўным у той час. У наш час яны існуюць самі па сабе, паралельна – БГКТ асобна, а рэдакцыя “Нівы” асобна.

Сёння “Ніва” выходзіць накладам у 700 экзэмпляраў, і яе можна спакойна набыць у беластоцкай сеткавай краме “Бедронка”. Газета, як і раней, асвятляе на сваіх старонках жыццё мясцовых беларусаў, звяртаецца да гісторыі і культуры.

Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына” шчыра віншуе выданне і жадае яму сустрэць 100 гадоў!

Budzma.org

гуатрка

# Зінаіда Клыга: ПАКУЛЬ МАГУ, БУДУ ПРАЦЯГВАЦЬ ТОЕ, ШТО З МЯНЕ ПАЧЫНАЛАСЯ



Фота: Peeter Lillevali

Працяг са старонкі 1.

На жаль, з кожным годам робіцца ўсё складаней – старыя сыходзяць, а моладзь не адчувае вялікай любові да сваіх каранёў, прыхільнасці да роднай мовы. Прычым я гэта заўважала нават у самой Беларусі.

**– У вашых уласных дзяцей такая цікавасць ёсць?**

– Калі ствараўся "БЭЗ", мае старэйшыя дзеці былі ўжо дарослыя. Як ва ўсіх маладых, у іх было шмат сваіх справаў. Але думаю, што малодшага сына ўдалося далучыць – ён удзельнічаў у розных мерапрыемствах, нават ездзіў са мной у Мінск на З'езд беларусаў свету. Яму заўсёды было цікава, але калі вырас і з'ехаў у Талін вучыцца, застаўся там жыць. Часам далучаецца да сталічных беларусаў, напрыклад, удзельнічаў у акцыі пратэсту пасля выбараў прэзідэнта Беларусі. Цяпер у яго свая сям'я і трое цудоўных дзетак, часу не хапае. Але думаю, што сваю ідэнтычнасць мае дзеці ўсведамляюць.

У Іда-Вірумаа шмат беларусаў, а цікавасць да каранёў трэба выхоўваць – прыходзіць у школы, дзіцячыя садкі, шукаць бацькоў і далучаць іх да справаў таварыства. Гэта вялікая праца – сустракаць, гаварыць, даваць наказы, дапамагаць. Патрэбныя людзі, якія маглі б гэта рабіць, вельмі спадзяюся, што гэта атрымаецца ў тых, хто прыйдзе ў "БЭЗ" мне на змену.

**– Збіраецеся перадаць стырно ўлады?**

– Ужо даўно б гэта зрабіла, каб знайшоўся такі энтузіяст, які меў бы жаданне і дастаткова моцы. Падхапіць эстафету магла б Тамара Ракавец, а я заўсёды гатовая дапамагаць парадамі і на справе. Рыхтую яе – разам ходзім на пасяджэнні Круглага стала, сябрам якога з'яўляецца "БЭЗ".

Пакуль жыву, буду працягваць тое, што з мяне пачыналася. Нават назву я прыдумала – абрэвіятура з "Беларуска-эстонскае згуртаванне" адначасова ўтварае слова "бэз", таму ў нашым доме шмат бэзу.

**– Ці часта вы збіраецеся ў гэтым утульным доме?**

– На жаль, ужо не так часта, як раней. Мы пастараліся стварыць утульнасць, але тут замала месца, каб збіраць вялікую аўдыторыю. А каб нешта арандаваць для правядзення больш буйных мерапрыемстваў, патрэбныя грошы. У "БЭЗа" іх няма. У нас няма падтрымкі ад гістарычнай радзімы, як у многіх іншых нацыянальных таварыстваў, але ў цяперашняй палітычнай сітуацыі гэта нават плюс – захаванне ўласнай годнасці, мы не падуладныя ніякім ідэалагічным уплывам.

Шчыры дзякуй Йыхвіскай воласці, якая дапамагае аплочваць арэнду гэтых памяшканняў – самі б не адужалі.

**– Ведаю, што "БЭЗу" шмат разоў даводзілася пераязджаць. Гэты працэс заўжды стамляе, рукі не апусціліся?**

– Спачатку мы базаваліся ў маім кабінеце – я працавала ў палацы культуры "Октообэр". Потым сустракаліся ў Йыхвіскай мастацкай школе – у Маргарыты Астраумавай, якая шмат гадоў была нашым лідарам. Потым яшчэ некалькі разоў даводзілася мяняць месца дыслакацыі. Лепш за ўсё нам жылося ў старым будынку Іда-Вірумааскага прафцэнтра – дазвалялі карыстацца вялікай залай для нашых мерапрыемстваў, і мы там шмат усяго ладзілі, запрашалі гасцей. Шэсць гадоў таму будынак пайшоў пад знос.

Цяпер наша маленькая Беларусь тут, і я лічу, што вельмі важна месца такое месца, дзе беларусы могуць сустракацца, гаварыць на роднай мове, адзначаць святы і падзеі, проста месца зносіны, захоўваць сваю культуру.

**– У вас тут вялікая бібліятэка з кніг на беларускай мове. Яны запатрабаваныя?**

– Ганаруся гэтым зборам. Выданняў так шмат, што прыйшлося прасіць у супрацоўнікаў Кохтла-Ярвескай бібліятэкі дапамогі, каб сістэматызаваць. Шмат кніг дарылі, шмат прывозілі з Беларусі, значная частка з маёй асабістай калекцыі. Цэлая паліца перакладаў Васіля Сёмухі – творы Томаса Мана, Гётэ, Ніцшэ, Біблія ды іншае. Я сябравала з ім з 1965 года, і "Фаўста" Гётэ ў ягоным перакладзе бачыла яшчэ ў рукапісе, да гэтага часу памятаю першую сустрэчу – у камуналцы, з пячным ацяпленнем. Мэблі не было, куфар, прыкрыты анучамі, з кнігамі... 18 студзеня яму споўнілася б 90 гадоў. Праз два гады атрымала раскошна ілюстраваную кнігу…

Кніг шмат, але чытаюць іх мала – на жаль, засталося няшмат мясцовых беларусаў, якія валодаюць роднай мовай. Размаўляюць патрошку ўсе, але мала мовай карыстаюцца. Зрэшты, я з гэтым і ў Беларусі сустракалася – вельмі зручна мець зносіны на рускай, таму што яе ўсе ведаюць. Калі раптам скончыцца "БЭЗ", то не ведаю-куды ўсё гэта падзецца? Але я ўсё ж такі спадзяюся, што ў будучыні знойдуцца тыя, каму гэтыя кнігі спатрэбяцца.

**– А калі вы самі апошні раз былі ў Беларусі?**

– Даўно. Цяпер мяне там ужо ніхто не чакае, ды і жадання няма ехаць. Пакуль руліць цяперашняя ўлада, мне там рабіць няма чаго.

**– Вы абмяркоўваеце тое, што адбываецца ў беларускай палітыцы? Гэта неяк уплывае на дзейнасць таварыства?**

– Не, таму што мы тут не займаемся палітыкай. Кожны мае права на сваё меркаванне, але мы гэта не абмяркоўваем, таму што аб'ядноўваем людзей паводле нацыянальнасці, а не палітычных поглядаў. Калі гэтыя тэмы хтосьці спрабуе ўзняць, адразу спыняю. Бо гэта не мае сэнсу, не хачу рабіць раскол у нашай суполцы. Вядома, у пэўнай ступені гэта ўсё адно адбіваецца – не ўсе могуць панаваць над эмоцыямі. Спіс нашых сябраў стаў меншы.

**– Якія ў беларусаў любімыя святы?**

– У студзені – Каляды. Увесну – Гуканне вясны, калі клікалі вясну, пяклі жаўрукоў і спявалі. З 6 на 7 ліпеня – Купалле, свята Івана Купалы. У канцы верасня – Багач, свята ўраджаю. 2 лістапада – Дзяды, дзень памяці памерлых. У мінулыя гады ўсе святкавалі, збіралі шмат гасцей. Цяпер усё часцей святкуем невялікім колам, але традыцыі не забываем.

**– Вы таксама адзін з ініцыятараў і актыўны сябра Круглага стала – унікальнага аб'яднання таварыстваў нацыянальных культур, добраахвотнай арганіза-**

**цыі, у якой ніхто ніколі не атрымліваў заробак, і якая вымагае шмат часу і адказнасці. Што вас прымушае працягваць?**

– Тое, што ў Іда-Вірумаа ёсць пункт, дзе збіраюцца людзі блізкага ўзроўню і ідэнтычнасці, і мы можам каардынаваць агульную цікавую працу, праводзіць яркія мерапрыемствы і ні на каго не ўплываць – гэта вельмі важна. Ганаруся, што датычная да гэтага.

**– Што вас асабіста цяпер натхняе?**

– Для натхнення мала месцаў і мала падставаў. Але ў верасні на фестывалі "Творчы кацёл" я выйшла на сцэну і праспявала адна а капэла, атрымаўшы такую зваротную сувязь, якая ўнутры выклікала шчырае захапленне. Натхнілася настолькі, што вырашыла зладзіць маленькі сольны канцэрт да свайго юбілею. Але потым перадумала.

**– Чаму?**

– Вырашыла, што для мяне гэта ўжо прамінулы этап. Не хачу шмат мітусіцца.

**– Але ж спевы заўсёды займалі вельмі важнае месца ў вашым жыцці?**

– Спяваю з дзяцінства, заўсёды і ўсюды хадзіла з гітарай. У Інстытуце спявала ў студэнцкім аркестры, але аднойчы сарвала голас і пасля гэтага шмат гадоў спявала толькі "на кухні", ля вогнішча... У 2001 годзе, калі прыйшла працаваць у гарадское кіраванне, паклікалі выступіць на юбілеі клуба маладых спецыялістаў – быў і такі. Потым яшчэ кудысьці пачалі клікаць. Падрыхтавала праграму, гадоў пятнаццаць выступала на розных сцэнах.

Нічога арганізоўваць сама ўжо не хачу, але калі запрашаюць – гатовая паўдзельнічаць. Нядаўна з Алай Барлінавой былі ў Йыхвіскай бібліятэцы, творчы вечар атрымаўся вельмі цёплым. У лютым на базе тэатра "Лепатрыйну" плануецца мерапрыемства пад назвай "Свае людзі", рыхтуюся. Гэта не будзе мой бенефіс, проста паўдзельнічаю. На такім узроўні, калі кудысьці запрашаюць і маё здароўе дазваляе, гатовая супрацоўнічаць.

**– У вас ёсць яшчэ адно яркае стварэнне – штогадовае "Цвятаеўскае вогнішча".**

– Гэта сусветны рух, які зарадзіўся ў 1986 годзе ў гонар дня нараджэння паэткі Марыны Цвятаевай. Мы падхапілі эстафету ў пачатку двухтысячных, ініцыятарамі былі я і Ніна Пятрухіна, таксама падключыліся мясцовыя паэты і аматары паэзіі. У першую нядзелю кастрычніка запальвалі вогнішча і чыталі вершы.

У апошнія гады сустрэчы праходзілі на беразе мора ў Тойла, пад прыгожай рабінай. Сцэнара не было, усё ішло ад душы і для душы. Збіралася больш за дваццаць чалавек, але з гадамі ўсё менш. У мінулым кастрычніку ўпершыню цвятаеўскае вогнішча не запалілі – не было каму.

Паміраюць людзі, сыходзяць традыцыі.

**– Ці прымушае ваш юбілей падводзіць нейкія вынікі?**

– Не. Гэта такі самы звычайны дзень нараджэння, як і ўсе іншыя. Я не баюся старасці, не кожнаму ўдаецца прайсці жыццёвы шлях такой даўжыні. Я задаволеная тым, як пражыла гады, і гэта не этап, не мяжа, а проста прыгожая дата, якую варта адзначыць і паспрабаваць жыць далей. З маім характарам – пакуль буду магчы, увесь час буду штосьці рабіць. Новага то распачаць ужо нічога не змагу і нават не стану замахвацца. Але ў меру сваіх сіл буду працягваць тое, што рабіла, і нічога не кідаць.

**– Што вы лічыце самым галоўным дасягненнем у сваім жыцці?**

– Сваю сям'ю, а не нейкія іншыя поспехі і ўзнагароды, якіх было шмат. Я шчаслівы чалавек, 2 лютага нашай сям'і споўніцца 58 гадоў. Усе гэтыя гады мы жывем у адным доме і ў адной кватэры.

У сваіх стасунках я заўсёды магла быць вельмі свабоднай, мне ніколі нічога не забаранялася, чым хацела, тым і займалася, але паспяваючы і ў хаце падтрымліваць парадак. Каб тут заўсёды было чыста і смачна пахла. Сям'я – гэта было і ёсць маё выратаванне, дапамога ў маіх пачынаннях. Ганаруся і радуюся, што ў мяне вельмі добрыя адносіны з дзецьмі. Адчуваю шчасце, калі яны прыязджаюць ці я сама да іх еду.

**Зінаіда Клыга**

Нарадзілася 25 студзеня 1946 года ў Беларусі.

1963 год – скончыла сярэднюю школу № 6 горада Кохтла-Ярве; вучылася ў Йыхвіскай музычнай школе па класе скрыпкі.

1969 год – скончыла Мінскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці "настаўнік рускай мовы, літаратуры і спеваў".

Працавала настаўнікам, бібліятэкарам, журналістам, кіраўніком па інтарэсах, рэферэнтам у Кохтла-Ярвескам гарадскім кіраванні.

З 2011 года ўзначальвае іда-віpускае Таварыства беларускай культуры "БЭЗ", перад гэтым была намеснікам старшыні таварыства.

Сябра Круглага стала нацыянальных культурных таварыстваў Іда-Вірумаа.

У 2019 годзе атрымала ад прэзідэнта Керсці Кальюлайд Ордэн Белай зоркі V ступені.

Замужам, мае трох дарослых дзяцей.

**Ірына Ківісельг, severnojepoberezhje.postimees.ee**

**навіны**

# БЕЛАРУСКІ ГІСТОРЫК АЛЯКСАНДР СМАЛЯНЧУК УГАНАРАВАНЫ СУМЕСНАЙ ПРЭМІЯЙ ДЗВЮХ ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Прэміяй за заслугі ў галіне гісторыі і захавання гістарычнай памяці, заснаванай Форумам супрацоўніцтва і дыялогу Польшча – Літва і польска-літоўскага Форуму дыялогу і супрацоўніцтва імя Ежы Гедройца ўганараваны беларускі гісторык прафесар Аляксандр Смалянчук.




У сваім выступе на ўрачыстай цырымоніі ўручэння прэміі ў музеі "Каралеўскія Лазенкі" ў Варшаве Смалянчук адзначыў, што трактуе атрыманую ім узнагароду як "прызнанне працы ўсіх беларускіх гісторыкаў, вымушаных пакінуць сваю краіну, у якой цяпер няма свабоды навуковых даследаванняў у галіне гуманітарных і грамадскіх навук, а іх удзельнікам пагражаюць рэпрэсіі".

На цырымоніі выступіў лаўрэат прэміі "Салідарнасць" імя Леха Валенсы, намеснік кіраўніцы Аб'яднанага пераходнага кабінета Павел Латушка. Ён адзначыў, што сёлета прэмія ўпершыню "пашыраная на прадстаўнікоў дэмакратычнай Беларусі". "

Ваша праца па вяртанні праўдзівай гісторыі – падмурак нашай годнасці. Ваша ўзнагарода – знак таго, што Беларусь – Еўропа, і Еўропа гэта прызнае, не жадаючы новай "жалезнай заслоны" па лініі Буга", – адзначыў Латушка, звяртаючыся да лаўрэата.

Смалянчук нарадзіўся ў 1959 годзе ў Гродзенскай вобласці. Доктар гістарычных навук, прафесар. Даследуе агульную гісторыю Беларусі, Літвы і Польшчы. Працуе ў Інстытуце славістыкі Польскай акадэміі навук.

Цырымонія ўручэння прэмій форуму супрацоўніцтва і дыялогу Польшча – Літва і Форуму дыялогу і супрацоўніцтва імя Ежы Гедройца з'яўляецца адным з найважнейшых мерапрыемстваў, прысвечаных пабудове дыялогу, узаемаразумення і супрацоўніцтва паміж Польшчай і Літвой, а таксама народамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

**pozirk.online**

гутарка

# "Асноўнае, што нас аб'ядноўвае – беларускасць". Аксана Акуневіч пра беларускамоўны летнік "Злёткі" і прастору "Аксяродак" у Батумі

Якія перамены адбываюцца ў жыцці беларускай дыяспары ў Грузіі, як можна паўдзельнічаць у арганізацыі беларускамоўнага летніка "Злёткі" і што новага ў беларускай шматфункцыянальнай прасторы "Аксяродак" у Батумі? "Будзьма беларусамі!" пагаварылі пра гэта з кіраўніцай "Аксяродка" Аксанай Акуневіч.




## Пераезд у новае памяшканне

Арэнда ў нашым цяперашнім памяшканні на вуліцы Давіда Клдзіяшвілі, 32 пачалася летась першага чэрвеня, а ў старым – скончылася першага ліпеня. Месяц мы паступова пераязджалі, але сказаць, што мы паўнавартасна запрацавалі на новым месцы, можна, бадай, з пачаткам навучальнага года – у Грузіі гэта 15 верасня, хаця ўлетку мы ўжо ладзілі асобныя імпрэзы. Свята халадніка, напрыклад. Нават тэатральны вечар быў, чытка-спектакль "Вечар" Дударава, які зрабілі Алена Зуй і Васіль Казлоў.

У нас цяпер тры паверхі, і атрымалася фізічна аддзяліць "Аксяродак", шматфункцыянальную беларускую прастору, дзе ладзяцца розныя культурныя імпрэзы, працуе беларуская бібліятэка і кавярня, пераважна для дарослых, ад школы з дзіцячым садком. Першы паверх – для дарослых, другі і трэці – для дзяцей і падлеткаў.

## Беларуская школа

У "Аксяродку" працуе беларуская школа. Сёлета ў нас вучацца дзеці і падлеткі з першага да дзясятага класа, хаця набор быў да 12 класа. Афіцыйна мы не кажам, што мы асобная школа, рыхтуем дзяцей да атэстацыі з дапамогай нашых грузінскіх партнёраў. Усе нашы вучні афіцыйна аформлены ў грузінска-французскай школе. Два разы на тыдзень яны ходзяць у грузінскую школу, дзе вывучаюць замежныя мовы: ангельскую, французскую і грузінскую, а тры разы на тыдзень займаюцца ў "Аксяродку". На беларускай мове вывучаюць усе агульнаадукацыйныя прадметы.

З Новага 2026 года таксама адкрылі другую, неафіцыйную суботнюю беларускую школку. Яна ўмоўна дармовая: бацькі скідаюцца данатамі, колькі могуць. Гэтых грошай хапае на заробак двух настаўнікаў з трох. Спрабавалі на гэта знайсці грантавае фінансаванне, але пакуль нічога не атрымалася. На школку ёсць попыт, вялікая цікавасць да яе. Канечне, адчуваецца, што ў Батумі засталося менш беларусаў. Калі мы першы раз адкрывалі суботнюю беларускую школку ў 2023 г., то было 78 заявак, а цяпер – толькі 20. Фактычна гэта людзі, якія пра нас ужо ведалі, хадзілі на заняткі раней і чакалі, пакуль мы адчынімся зноў.

У нас у школах і садку вельмі шмат свабоды і антыгламуру. Дзеці самі шмат чаго робяць для сябе. Не ўсім сем'ям гэта падыходзіць. Часта ў эканамічных мігрантаў, працаўнікоў IT-сферы, іншыя патрабаванні і стандарты. Да таго ж, шмат у каго няма адчування каштоўнасці беларускага. Аддаюць дзяцей у школы з рускай мовай, бо з ёй быццам бы лягчэй паступіць. Пытанне, куды?...

## Прастора для імпрэзаў

У параўнанні з папярэднім памяшканнем у "Аксяродку" з'явілася больш прафесійная сцэна, з кулісамі. Суадносна, больш прафесійныя тэатральныя пастаноўкі. Большая зала, зручнейшыя крэслы, і агулам больш утульна. Як я ўжо казала, мы аддзялілі прастору "Аксяродак" ад школы, таму ў бібліятэку можна цяпер прыходзіць на цэлы дзень: сядзець чытаць, працаваць, як у каворкінгу.

Мы адкрылі пры "Аксяродку" кавярню "Стары маёнтак". Нам аддалі для яе антыкварную мэблю. Прапануем каву, гарбату. Пераважна я сама там працую. Выбар напояў і кошты стандартныя, як у суседніх кавярнях у парку 6 мая, трохі ніжэй за сярэдні па Батумі.

З новага ў "Аксяродку" – курсы грузінскай і польскай мовы для дарослых-пачаткоўцаў, польскі размоўны клуб. Плануем таксама курсы польскай для дзяцей. Польшча – асноўны кірунак міграцыі беларусаў з Батумі, таму курсы карыстаюцца попытам.

Грузінская мова – ужо менш, бо ніхто не ведае, колькі нам тут жыць засталося. Да таго ж, у Батумі складана стасавацца з грузінамі на грузінскай. З аднаго боку, стаўленне як да турыстаў, для зручнасці пераходзяць на расейскую ці ангельскую, а з другога боку, аджарцы, грузіны, якія пераважна жывуць у Батумі, дастаткова закрытыя нават адносна іншых грузінаў, што ўжо казаць пра замежнікаў. (Аджарыя – рэгіён у Заходняй Грузіі са сталіцай у Батумі – рэд.). А яшчэ экспаты ў Батумі, можна сказаць, аддзелены ад грузінаў геаграфічна. Грузіны лічаць, што жыць ля мора шкодна для здароўя, лепш бліжэй да гор. Таму яшчэ пару год таму некалькі вуліц, бліжэйшых да мора, займалі тыя, хто пераехаў у Сакартвэла яшчэ ў часы СССР, альбо нядаўнія экспаты, а грузіны жылі далей. Цяпер ужо трохі перамяшаліся: і прыезджыя здымаюць жытло бліжэй да гор, бо там танней, і грузіны сталі жыць ля мора.

## Экалагічнасць

Для мяне вельмі важныя ўстойлівасць і экалогія. Таму я адразу настаяла, каб у "Аксяродку" выкарыстоўваўся толькі шматразовы посуд. Гэта стварае праблему для працы кавярні: часам людзям хочацца зайсці і нешта ўзяць з сабой. Мне самой часам хочацца так зрабіць: пайсці, трымаючы нешта ў руках. Мы маем аднаразовы посуд, але імкнемся яго не выкарыстоўваць нават на вялікіх імпрэзах.

Акрамя таго, мы просім людзей пакідаць у "Аксяродку" непатрэбныя рэчы. Канцылярскія прыналежнасці могуць спатрэбіцца для працы школы, нешта прыдасца для рукадзелля.

Пабытавыя рэчы служаць абменным фондам: нехта з'язджае, нехта прыязджае і можа ўзяць сабе. Для нас гэта пэўныя цяжкасці, бо рэчы трэба сартаваць, недзе захоўваць, але для беларусаў – вялікая падтрымка і ўсё ж клопат пра навакольнае асяроддзе.

Імкнемся мінімізаваць выкарыстанне расходных матэрыялаў. І ў нашай звычайнай, і ў суботняй школе расказваем дзецям: "Калі вы бераце папяровую сурвэтку, то памятайце, што на яе выраб пайшло восем літраў вады. Падумайце, ці трэба вам тры-чатыры сурвэткі, ці хопіць адной". Імкнемся прышчапіць экалагічную свядомасць.

## Беларускамоўны летнік "Злёткі"

Сёлета мы ўжо чацвёртым разам будзем ладзіць міжнародны аздараўленча-адукацыйны беларускамоўны летнік "Злёткі". Папярэдне плануем з 16 да 27 ліпеня, мо плюс пару дзён.

Ідэя летніка – сабраць у адным месцы беларускіх дзяцей і падлеткаў (прымаем удзельнікаў ад пяці да васямнаццаці год) з розных краін, і з Беларусі, і з дыяспар. Асноўнае, што нас аб'ядноўвае – беларускасць.

Прыязджаюць таксама дарослыя, у іх свой, асобны "атрад", са сваёй праграмай, але і ўдзелам у агульных мерапрыемствах. Для дарослых удзел ва ўсіх актыўнасцях – добраахвотны. Па водгуках, гэта цудоўны варыянт адпачынку, калі не трэба ні пра што думаць, бо за цябе ўжо ўсё прадумалі.

Удзельнікі лічаць такі летнік сродкам падтрымкі сваёй ідэнтычнасці, што, кажуць, вельмі натхняе.

Летнік ладзіцца на Чорным моры, у курортным пасёлку Урэкі, вядомым сваімі пляжамі з магнітным чорным пяском (Большасць пляжаў у Ад-

жарыі камяністая – рэд.). Штодня двойчы ходзім на мора, а ўвечары ў нас – агульныя імпрэзы, свечка-рэфлексія. Таксама робім экскурсійныя выезды.

Самае важнае, што аб'ядноўвае ўсіх удзельнікаў, – гэта беларуская мова. Не ўсе, хто прыязджаюць, добра ёй валодаюць, некаторыя зусім не размаўляюць па-беларуску, але прынамсі маюць цікаўнасць да беларушчыны. Супрацоўнікі ж летніка, важатыя – усе беларускамоўныя.

**Беларусы Батумі**

З Беларусі яшчэ прыязджаюць у Сакартвэла новыя людзі: нехта таму, што да іх прыйшлі, нехта па працы (рэлаканты), а нехта проста хоча да цяпла. Увесь час ёсць плынь, хай ужо і не такая вялікая. Шмат і з'язджае, бо ў Грузіі мяняецца заканадаўства: з першага сакавіка трэба будзе мець дазвол на працу, нават калі ты ІП. Праўда, незразумела, якая будзе практыка выкарыстання гэтага закону. Нават ідучы па горадзе, заўважаеш, што шмат экспацкіх кавярняў ды іншых бізнесаў пазачыняласа, людзі з'ехалі.

З Беларусі і раней кліматычныя мігранты ехалі на зімоўку, у тым ліку ў Сакартвэла. Пасля 2020 г. выязджалі ўжо масава і на сталае месца жыхарства. Мне здаецца, каб не загад, што за мяжой нельга абмяняць беларускі пашпарт, і не змены ў грузінскім заканадаўстве, то беларуская дыяспара ў Сакартвэла была б вельмі вялікай. Нават цяпер я ўвесь час сустракаю беларусаў, якіх не ведаю, і якія не ведаюць пра "Аксяродак". З вялікай згуртаванай хвалі эміграцыі прайшло ўжо некалькі гадоў, людзі паабжываліся і, можа быць, цяпер няма такой патрэбы быць усім разам, шукаць сваіх.

Беларуская дыяспара ў Батумі адрозніваецца ад іншых сваёй згуртаванасцю і нізкай канкурэнтнасцю. Дапамагаем адно аднаму і справай, і "проста пагутарыць".

Пераезд "Аксяродка" ладзілі талакой. Самі б мы проста не справіліся. Уплывае памер горада: Батумі ў параўнанні з Тбілісі ці Варшавай невялікі, таму людзі мо часцей кудысьці выбіраюцца з дому. Атрымліваецца сяброўская, прыяцельская тусоўка, чымсьці падобная да студэнцкай.

**Супраца з "Аксяродкам"**

Калі вы прыязджаеце ў Батумі ў кароткі адпачынак і хочаце чымсьці падзяліцца, зладзіць нейкае адукацыйнае мерапрыемства, майстар-клас – звязвайцеся з намі. Калі вы хочаце паўдзельнічаць у беларускім жыцці "Аксяродка" даўжэй, можаце пабыць у нас валанцёрам / валанцёркай: жыць у нашай прасторы (мы маем для гэтага спецыяльны пакой), працуючы прыкладна па чатыры гадзіны на дзень. Праца абсалютна розная: улетку нам быў актуальны рамонт, потым была дзяўчына, якая разбірала рэчы. Калі валанцёры беларускамоўныя, могуць пабыць на замене ў садку ці школе.

Запрашаем валанцёраў таксама ў якасці важатых на летнік "Злёткі". Аплоцім пералёт і ўсе кошты пражывання. Разлічваем, што за гэта чалавек працуе цэлы дзень, а пасля летніка мае магчымасць застацца адпачыць у Сакартвэла, пажыць у "Аксяродку".

Мы працягваем збіраць бібліятэку "Аксяродку". Пераважна там беларускія кнігі, але не толькі. Калі да нас нехта прыязджае з Польшчы, Літвы, дзе вялікія беларускія дыяспары і больш магчымасцяў набыць новыя кнігі, мы заўсёды просім гэта зрабіць. Часта людзі здзіўляюцца, што мы маем шмат навінак беларускай літаратуры, якая выходзіць па ўсім свеце. Мы прымаем і новыя кнігі, і тыя, што выдадзены даўно. Напрыклад, я перавезла з Беларусі сваю асабістую бібліятэку, і яна стала часткай бібліятэкі "Аксяродку". Там шмат кніг, якія ўжо не перавыдаюцца і не прадаюцца. Таму, калі вы маеце непатрэбныя кнігі на беларускай, украінскай, польскай, ангельскай мовах, мы з задавальненнем і вялікай удзячнасцю іх прымем.

Заўсёды радыя, канечне, фінансавай падтрымцы. Калі вы – спонсар, які хоча падтрымліваць беларускую справу, ці разова нам заданаціць, на нашых старонках можна знайсці рэквізіты грузінскай карткі, польскай, крыптагаманца, By Me a Coffee. Гэтыя грошы ідуць пераважна на арэнду памяшкання. Апошнім часам данатаў стала значна менш – адчуваецца, што беларусы з'язджаюць з Сакартвэла.

Будзьма беларусамі па ўсім свеце!

**Алеся Лях, Budzma.org**




**Украіна**

# БЕЛАРУСЫ ВІЛЬНІ ПАДТРЫМАЛІ БЕЛАРУСКІХ ВАЯРОЎ

У пачатку тыдня беларусы Вільні адправілі аўтамабіль на патрэбы ЗСУ і гуманітарную дапамогу ва Украіну. Таксама яны сабралі сродкі на рамонт мікрааўтобуса для беларускіх ваяроў, які зараз знаходзіцца на ўкраінскай тэрыторыі.

На транспарт збіралі сродкі сябры беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі "Народная грамада", а гуманітарную дапамогу сабралі валанцёрская арганізацыя "Дапамога" і "Наш дом".

Паводле выконваючага абавязкі кіраўніка партыі "Народная грамада" Яўгена Вільскага, падтрымка Украіны і беларускіх ваяроў на фронце – гэта адна з прыярытэтных мэтаў партыі:

– Мы заўсёды працуем на гэтым кірунку, шмат сяброў нашай партыі ваявала ва Украіне і зараз знаходзяцца там. Шмат хто валанцёрыць, ёсць, якія туды ездзяць, ёсць, якія пастаянна там жывуць. Мы лічым, што падтрымка Украіна – адна з галоўных мэтаў для любой беларускай арганізацыі. Не ўсе з намі згодныя, але тым не менш мы пастаянна займаемся тым, што мы можам у нашых няпростых умовах.

Паводле Яўгена Вільскага, гэта ўжо шостая машына ад "Народнай грамады" на патрэбы вайскоўцаў. Але яны і надалей будуць падтрымліваць беларускіх ваяроў ва Украіне і ўвогуле ЗСУ.

**racyja.com**

# БЕЛАРУСКІЯ ДОБРААХВОТНІКІ ВА УКРАІНЕ АТРЫМАЮЦЬ ПРАВАВЫ СТАТУС

Камандзір узводу кіравання беспілотных сістэм у Узброеных сілах Украіны Андрэй Кушнярoў пракаментаваў прыняцце ва Украіне закона №14052/П (у фінальнай рэдакцыі – Закон №4730-IX), які рэгулюе прававы статус замежнікаў і асоб без грамадзянства ва ўкраінскай арміі.

Паводле Кушнярова, пасля чацвёртага года вайны беларускія добраахвотнікі нарэшце атрымалі афіцыйнае прызнанне свайго статусу, што дае ім права на легалізацыю, медыцынскае забеспячэнне і сацыяльныя гарантыі:

– Калі заканчваецца ўжо чацвёрты год вайны, нарэшце мы ўжо атрымліваем афіцыйны статус. Гэта, папершае, дае магчымасць больш-менш атрымліваць дакумент на знаходжанне або ВНЖ. Праз год службы можна падаваць прашэнне на атрыманне грамадзянства, хто гэтага хоча. Шмат у каго заканчваецца пашпарт. Ёсць надзея, што, магчыма, прыпыніцца блакаванне рахункаў у банках.

Закон падпісаны Прэзідэнтам Украіны Уладзімірам Зяленскім і ўступіць у сілу праз тры месяцы пасля афіцыйнай публікацыі, што азначае, што ўсе правы і гарантыі для замежных добраахвотнікаў стануць дзейнымі праз гэты тэрмін. Дакумент рэгулюе прававы статус, медыцынскае забеспячэнне і сацыяльныя гарантыі іншаземцаў і асоб без грамадзянства, якія служаць у ЗСУ і іншых вайсковых фармаваннях.

**racyja.com**



навіны

# РАДЫЁВЯДОЎЦУ І МУЗЫКУ АЛЕГА ХАМЕНКУ ПРЫГАВАРЫЛІ ДА 3 ГАДОЎ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

4 сакавіка Мінскі гарадскі суд вынес вырак музыку, даследчыку, радыёвядоўцу Алегу Хаменку. Яго прызналі вінаватым паводле артыкула 361–4 Крымінальнага кодэкса – "Садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці".



У віну Алегу Хаменку паставілі сталую супрацу з рэдакцыяй "Беларускае Радыё Рацыя".

Судовы працэс над Алегам Хаменкам пачаўся 19 лютага 2026 года. За гэты час адбылося некалькі пасяджэнняў. У выніку 4 сакавіка 2026 года Мінскі гарадскі суд агучыў вырак: тры гады пазбаўлення волі з адбыццём у калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму і буйны штраф – больш за 20 000 рублёў.

Крымінальная справа, як вынікае з таго, што на экспертызу былі адпраўленыя выпускі музычных праграм Хаменкі на "Радыё Рацыя", распачатая менавіта за супрацу з радыёстанцыяй.

Алег Хаменка быў затрыманы ў Мінску ў 17 чэрвеня 2025 года пасляператрусу ў яго кватэры. Спачатку на падставе адміністрацыйнага абвінавачання яго змясцілі ў ІЧУ на Акрэсціна. А ў першых датах ліпеня стала вядома, што супраць радыёвядоўцы распачалі крымінальную справу і яго перавялі ў следчы ізалятар № 1 у Калядзічах.

9 ліпеня 2025 года беларуская праваабарончая супольнасць прызнала Алега Хаменку палітычным вязнем.

Музыка, выкладчык, кампазітар, прадзюсар і радыёвядоўца Алег Хаменка вядомы як прамоўтар беларускай музыкі праз радыё. Ён ствваральнік фолк-мадэрну – новага кірунку ў сучаснай беларускай музыцы, лідар папулярнага гурта "Палац".

Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры. У 1992 годзе стварыў гурт "Палац", з якім запісаў шэсць студыйных альбомаў.

У 2008 скончыў аспірантуру БДУКіМ па спецыяльнасці культуралогія. Працаваў старэйшым выкладчыкам кафедры "Рэжысура эстрады" БДУКіМ.

У 2008-м браў удзел у нацыянальным адборы на "Еўрабачанне" з песняй "Кола грукатала". У 2009 годзе стварыў фестываль "Bela music", які праходзіў на аэрадроме "Баравая". Пасля 2020 года "Палац" застаўся ў краіне і часам выступаў.

У нулявых стварыў і вёў праграму "Брама існасьці" на "Аўтарадыё", з канца нулявых стала супрацоўнічаў з "Радыё Рацыя". Ягоныя музычныя праграмы "Тузін гітоў" і "Фолькбрама" выходзілі ў эфіры шмат гадоў да самага затрымання.

"Беларускае Радыё Рацыя" – радыёстанцыя, якая кругласуткава вяшчае на беларускай мове на тэрыторыі Беларусі, Польшчы і Літвы на частаце FM і ў інтэрнэце. Падае інфармацыю пра грамадска-палітычныя, эканамічныя і культурныя падзеі ў Беларусі і свеце. Рэдакцыя медыя з 1999 года месціцца ў Беластоку (Польшча).

З верасня 2021 года доступ да сайта радыёстанцыі наведнікам з Беларусі быў заблакаваны на загад Міністэрства інфармацыі. 16 студзеня 2024 года рашэннем КДБ "Беларускае Радыё Рацыя" прызнаная "экстрэмісцкім фармаваннем".

Паводле дзеючага беларускага заканадаўства, асобы, прызнаныя ўдзельнікамі экстрэмісцкага фармавання, могуць быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці па артыкулах "Стварэнне экстрэмісцкага фармавання альбо ўдзел у ім" (артыкул 361–1 КК) ці за "Садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці" (артыкул 361–4 КК). Санкцыі паводле гэтых артыкулаў – да 10 гадоў пазбаўлення волі.

**baj.media**

абвестка

# ПРАЦУЕЦЕ Ў ЛІТВЕ І ЧЫТАЕЦЕ BUDZMA.ORG? ПАДТРЫМАЙЦЕ КАМАНДУ, ПЕРАЛІЧЫЎШЫ 1,2% АД СВАІХ ПАДАТКАЎ

Працуеце ў Літве і чытаеце "Будзьма беларусамі!"? Гэта вам цікава і патрэбна? Падтрымайце каманду, перадаўшы 1,2% ад сваіх падаткаў! І пры гэтым вам уласна гэта не будзе каштаваць анічога!!!

Культурна-асветны партал budzma.org працуе для беларусаў, якія і ў Беларусі, і раскіданыя па ўсім свеце.

Дзякуючы вашай падтрымцы, каманда зможа ствараць больш якасных відэапраектаў, гістарычных артыкулаў і інтэрв'ю з беларускімі творцамі, а калумністы працягнуць рэгулярна весці свае калонкі.

Калі вы працуеце ў Літве, вы можаце падзяліцца з "Будзьмай" часткай свайго падатку. З тых грошай, якія вы ўсё адно будзеце плаціць як падатак за атрыманы прыбытак, вы можаце ахвяраваць 1,2% на дзейнасць партала. Трэба ўсяго-ткі пра падачы дэкларацыі зрабіць некалькі дадатковых клікаў.

Інструкцыя для тых, хто знаходзіцца ў Літве – па спасылцы: zbsb.info/?p=28009 .

**budzma.org**

## Беларускі каляндар памятных дат на люты 2026 года

**2 сакавіка**
- 130 гадоў таму, у 1896-м, нарадзіўся Станіслаў Глякоўскі, каталіцкі духоўнік, выдавец. Загінуў у 1941-м.

**4 сакавіка**
- 115 гадоў таму, у 1911-м, нарадзіўся Васіль Стома, пісьменнік, дзеяч эміграцыі ў ЗША. Памёр у 1992-м.
- 70 гадоў таму, у 1956-м, у Беластоку выйшаў першы нумар газеты „Ніва", тыднёвіка беларусаў у Польшчы.

**5 сакавіка**
- 130 гадоў таму, у 1896-м, нарадзіўся Кандрат Крапіва (сапр. Атраховіч), пісьменнік, мовазнавец. Памёр у 1991-м.

**7 сакавіка**
- 95 гадоў таму, у 1931-м, памёр Павел Дземідовіч, этнограф.

**8 сакавіка**
- 125 гадоў таму, у 1901-м, нарадзіўся Аляксандр Карповіч, выдавец. Памёр у 1986-м.

**10 сакавіка**
- 245 гадоў таму, у 1781-м, памёр Міхаіл Карыцкі, паэт.

**11 сакавіка**
- 135 гадоў таму, у 1911-м, нарадзіўся Леў Гарошка, уніяцкі рэлігійны дзеяч, гісторык, выдавец, дзеяч эміграцыі ў Францыі і Вялікабрытаніі. Памёр у 1977-м.
- 85 гадоў таму, у 1941-м, загінуў Аляксандр Уласаў, выдавец.

**12 сакавіка**
- 175 гадоў таму, у 1851-м, памёр Ян Баршчэўскі, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры.

**17 сакавіка**
- 75 гадоў таму, у 1951-м, памёр Альберт Паўловіч, пісьменнік.

**19 сакавіка**
- 105 гадоў таму, у 1921-м, нарадзіўся Язэп Юхо, юрыст, гісторык права. Памёр у 2004-м.

**20 сакавіка**
- 50 гадоў таму, у 1976-м, памёр Уладзімір Дубоўка, паэт.
- 30 гадоў таму, у 1996-м, памёр Яраслаў Пархута, пісьменнік.

**22 сакавіка**
- 240 гадоў таму, у 1786-м, нарадзіўся Яўхім Лялевель, ідэолаг паўстання 1830–1831 гг. Памёр у 1861-м.

**25 сакавіка**
- Дзень Волі

**27 сакавіка**
- 175 гадоў таму, у 1851-м, нарадзіўся Аляксей Сапуноў, гісторык. Памёр у 1924-м.

**28 сакавіка**
- 140 гадоў таму, у 1886-м, памёр Уладзіслаў Борзабагаты, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг.

**Беларусы ў свеце**
№ 2 (285), люты 2026
Інфармацыйны бюлетэнь
Супольнасць беларусаў
свету "Бацькаўшчына"

Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі.
Меркаванні аўтараў могуць не супадаць з думкай рэдакцыі.

Адказныя за нумар –
Н. Шыдлоўская,
А. Макоўская

Наклад 250 асобнікаў

zbsb.info e-mail: zbsb.minsk@gmail.com